ПРАЦОЎНАЯ
# САЛІДАРНАСЦЬ

*Газета для рабочых* *№3 верасеень 2009 г.*

# Уседазволенасць і беспакаранасць

**Кіраўніцтва шклозавода “Нёман” зноў парушыла Працоўны кодэкс. Цэх вырабаткі №3 і цэх апрацоўкі, згодна загаду №529, надалей будуць працаваць па 4 гадзіны. Але і гэты загад, і папярэдні за №481, выдадзеныя з парушэннем дзейнага заканадаўства. Артыкул 32 Працоўнага кодэкса прадугледжвае, што пра істотныя змены умоваў працы (да якіх адносіцца і рэжым працы) наймальнік *абавязаны пісьмова папярэджваць работніка не пазней, чым за месяц.* А тут загад №481, паводле якога пераход на 4-хгадзінную змену адбыўся з 1-га жніўня, выдадзены 27 ліпеня, вывешаны ў цэх 28-га, а распісваліся за азнаямленне з гэтым загадам толькі 16-га жніўня! А наступны загад, аб 4-гадзіннай працы з 1-га верасня, наогул выдалі толькі 31-га жніўня, а для азнаямлення рабочым быў вывешаны 3-га верасня. Дзе законнасць, дзе парадак?**

**Хаця, пра якія законнасць і парадак можна гаварыць, калі на нашым прадпрыемстве ўжо даўно на іх не зважаюць. То загадамі, а то і без паведамлення, пераганяюць рабочых з аднаго банка ў другі, то з парушэннямі законаў пераводзяць на кантракты, то “дабраахвотна-прымусова” распаўсюджваюць латарэі, то здымаюць з працоўных месцаў для дактыласкапіі. Ня кажучы ўжо пра затрымкі выплатаў заробкаў. А на кожную з гэтых сітуацыяў ёсць артыкул у заканадаўстве, і па гэтых артыкулах наймальнік павінен несці адказнасць. Ды толькі хто ж прыцягне яго да той адказнасці? Вакол маўклівая абыякавасць.**

**Расказвалі, як аднойчы дырэктар завода Бацян І.М. выказаўся прыблізна такімі словамі: ”Такіх дурняў, як у Бярозаўцы, яшчэ пашукаць трэба, што хачу – тое раблю, а яны маўчаць!” Няўжо гэта так?**

*Яська Нязгодны*

# Харчаванне ў кошт зарплаты

Такое зараз практыкуецца на некаторых прадпрыемствах Беларусі. У кіраўніцтва прадпрыемстваў няма грошай, каб выплочваць заробкі, і рабочым прапаноўваюць харчавацца ў завадскіх сталовых “у крэдыт”, а таксама набываць прадукты харчавання ў завадскіх гандлёвых кропках.

На МТЗ выдаюць у кошт будучага заробку пяльмені, на БАТЭ – сыр і малако, на ММЗ наогул работнікам “рэкамендавана” пакідаць на заводзе не менш за 20% заробку, разлічваючыся па прапусках за абеды ў сталовых, за прадукты і тавары надзённага спажывання ўласнай вытворчасці ў гандлёвых кропках прадпрыемства, а таксама за паслугі стаматалогіі, транспартнага і рамонтна-будаўнічых цэхаў.




Мінскі маторны завод (ММЗ) таксама прапануе сельгаспрадпрыемствам рухавікі, запчасткі і нават новыя трактары ў абмен на 3 тоны мяса, якое будуць выдаваць рабочым у кошт заробкаў.

Пры такіх тэмпах скарачэння даходаў насельніцтва і росце цэнаў, хутка будзем працаваць за адно харчаванне, бо астаніх грошай хопіць хіба толькі на аплату жылля ды на адзенне з сэканд-хэнду.

# НЯМА ІНФАРМАЦЫІ – НЯМА ПРАБЛЕМЫ?

Улады прынялі чарговае «антыкрызіснае рашэнне» - спынілі публікацыю звестак пра складскія запасы.

За апошнія паўгады звесткі пра складскія запасы беларускіх вытворцаў і экспарцёраў сталі настолькі ж масавай і запатрабаванай інфармацыяй як зводка надвор'я на заўтра і выходныя. Гэтыя звесткі дазваляюць больш рэальна ацаніць «дасягненні» лукашэнкаўскай эканамічнай мадэлі як эксперту, так і шараговаму грамадзяніну.

Такі падыход не выклікае здзіўлення, бо ўжо выкарыстоўваўся. Той жа Нацбанк Беларусі перастаў публікаваць звесткі пра сальда куплі-продажу наяўнай валюты на ўнутраным рынку. У кожным з выпадкаў было сваё тлумачэнне, але сутнасць усіх зводзілася да таго, каб залішне не бударажыць і без таго ўзбудараражанае меркаванне грамадскасці.

Але, як заўсёды, прадстаўнікі ўлады тлумачаць усё клопатам пра людзей. Вось і па гэтым пытанні высокапастаўлены чыноўнік Белстата патлумачыў, што "ўзнікла пытанне, ці не зашкодзім мы нашым экспарцёрам, публікуючы гэтыя звесткі". Нібыта, «вытворца хоча не проста прадаць сваю прадукцыю, а прадаць яе як мага больш выгадна. Але пакупнікі, паінфармаваныя пра ўзровень складскіх запасаў, пачынаюць выстаўляць невыгадныя ўмовы».

Нягледзячы на тое, што паводле афіцыйных звестак складскія запасы на 1 жніўня 2009 годы склалі 88,3% ад сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці, нібыта знізіўшыся з 94,6% на 1 ліпеня 2009 года, ніхто сур'езна не ўспрымае гэтае дасягненне. Паколькі хаваюць, значыць, ёсць што хаваць – такую логіку нічым не пераможаш.

Як мяркуюць эканамісты, калі б у дырэктараў беларускіх прадпрыемстваў было права на самастойнае рашэнне, большасць ужо даўно спынілі б свае канвееры, змагаючыся за кожны рубель свабодных грашовых сродкаў на сваім разліковым рахунку. Але ёсць загад – любымі сродкамі працягваць вытворчасць (нікому не патрэбную), каб захаваць працоўныя месцы (няхай і з меншымі ўдвая заробкамі).

Вось толькі куды мы прыйдзем гэтым шляхам?

*Л.Някозік*

# Незадаволенасць нарастае

Незалежныя прафсаюзы правялі анкетаванне рабочых па ўсёй Беларусі, каб высветліць, як жывуць простыя людзі ва ўмовах фінансавага крызісу. Абсалютная большасць апытаных лічаць, што матэрыяльнае становішча пагоршылася, даходы зменшыліся на 30-40%.

У анкетах былі наступныя пытанні: "Колькі дзён у тыдні працуе ваша прадпрыемства? Як аплочваюць прастоі? Як вы ацэньваеце сваё матэрыяльнае становішча? Якія прычыны пагаршэння і як выходзіць з сітуацыі?"

Адказы рабочых з розных рэгіёнаў вельмі падобныя. Многія вінавацяць у эканамічных праблемах кіраўніцтва прадпрыемстваў, якое непрафесійна выконвае свае функцыі, а таксама вышэйшае кіраўніцтва краіны.



Многія апытаныя мяркуюць, што для вырашэння гэтых праблем трэба патрабаваць ад кіраўніцтва краіны эфектыўнай працы і вынікаў, а таксама неабходна выпрацаваць патрабаванні да наймальнікаў і дамагацца іх выканання. Каля паловы анкетаваных гатовыя ўдзельнічаць у масавых акцыях пратэсту пры ўмове іх арганізаванасці і дазволенасці. Некаторыя баяцца ўдзельнічаць у акцыях пратэсту, а некаторыя лічаць, што "лепш не высоўвацца, ўсё роўна нічога не зменіш".

Па словах кіраўніка прафсаюза РЭП Генадзя Фядыніча, гэтае анкетаванне ладзілася з мэтай высветліць, наколькі задавальняе рабочых сённяшняе становішча, каго яны лічаць вінаватымі ў такой сітуацыі, а таксама ці гатовыя яны выпрацаваць свае патрабаванні.

Апрацаваныя дадзеныя анкет будуць даведзеныя да адміністрацый прадпрыемстваў. На падставе адказаў кіраўніцтва незалежных прафсаюзаў выпрацуе патрабаванні да наймальнікаў, якія дапамогуць рабочым дамагчыся паляпшэння ўмоваў працы ў адпаведнасці з іх уласнымі патрэбамі.

*Паводле "Заўтра тваёй краіны"*

# УРАД ЭКАНОМІЦЬ. НА ЗДАРОЎІ ГРАМАДЗЯН

**Паводле пастановы ўраду Беларусі № 1000, тавары замежнай вытворчасьці прадпрыемствы краіны могуць набываць толькі з дазволу дзяржаўных органаў. Гэтая пастанова распаўсюджваецца і на шпіталі і аптэкі.**

**Працаўнікі беларускіх аптэкаў зазначаюць, што імпартных лекаў паменела. На іх думку, зусім без замежных прэпаратаў абысціся нельга, бо не па ўсіх групах ёсць айчынныя адпаведнікі.**

**Таксама адзначаюць, што ёсць украінскія і расійскія прэпараты, якія значна таннейшыя за еўрапейскія, хаця і больш нізкай якасці. Самі фармацэўты пры неабходнасці аддаюць перавагу арыгінальным прэпаратам, пры гэтым пагаджаюцца, што ў большасці яны распрацоўваюцца і вырабляюцца толькі ў Еўропе.**

**Распараджэнне Міністэрства аховы здароўя аб выканананьні ўрадавай пастановы № 1000 атрымалі таксама мэдычныя цэнтры і шпіталі. Яе выканананьне пацягне за сабой пагаршэньне стану здароўя жыхароў краіны, бо айчынныя прадпрыемствы вырабляюць толькі каля 25% найменьняў лекавых прэпаратаў з 6 тысяч зарэгістраваных. Гэта, безумоўна, будзе ўплываць на стан здароўя людзей. Бо па-сапраўднаму ніводнае беларускае фармацэўтычнае прадпрыемства не прайшло сэртыфікацыі на міжнародныя стандарты якасці фармакалагічнай прадукцыі. Яшчэ адна праблема — гэта дэфіцыт сродкаў у сістэме аховы здароўя. Таму лекары будуць выконваць гэты цыркуляр міністэрства і, адпаведна, людзі будуць больш хварэць, і ў краіне можа падвысіцца ўзровень смяротнасці, асабліва сярод найменш абароненых групаў насельніцтва.**

*Паводле "Радыё Свабода"*

---

# Бензінавыя клопаты

На пачатку верасня ўрад Беларусі адобрыў рашэнне аб падвышэнні цэнаў на нафтапрадукты ў сярэднім на 10%. Гэты крок матывуецца стратнасцю рэалізацыі паліва ва ўмовах падвышэння цэнаў на нафту. Незалежныя эканамісты мяркуюць, што рашэнне ўрада закране не толькі аўтааматараў, але і ўсіх спажыўцоў адразу. Падаражэюць аўтаперавозкі, а значыць вырастуць цэны на большасць тавараў, а таксама на праезд у грамадскім транспарце.




Супраць гэтага рашэння выступалі Міністэрства транспарту і Міністэрства сельскай гаспадаркі.

Яшчэ адна непрыемная для ўладальнікаў аўтамабіляў вестка: кіраўніцтва краіны мае задуму прадаваць усю нафтапрадукцыю за мяжу, каб забяспечыць паступленні валюты ў дзяржбюджэт (прадукцыя нашых нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў адпавядае Еўрапейскім стандартам якасці). Для задавальнення попыту ўнутры краіны мяркуецца закупляць расійскае паліва, таннейшае і горшае па якасці, з большым утрыманнем серы.

Так што не здзіўляйцеся, калі праз паўгады рухавік вашага аўтамабіля адмовіцца нармальна працаваць: гэта вам прывітанне ад клапатлівага ўрада!

*П.Кілішкевіч*
*Паводле by.net*

## Незалежныя прафсаюзы плануюць мітынг

Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў і прафсаюз РЭП маюць намер правесці маніфестацыю ў Дзень барацьбы за годную працу, які адзначаецца ва ўсім свеце 7-га кастрычніка. Мяркуецца, што ў акцыі прыме ўдзел каля 500 чалавек.

Гэты дзень штогод адзначаюць прафцэнтры Міжнароднай Канфедэрацыі прафсаюзаў (у якую ўваходзіць і Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў).

На думку намесніка старшыні БКДП Мікалая Канаха, улады мусяць дазволіць мерапрыемства. Бо адмова ў гэтым выпадку наяўна прадэманструе, як беларускія ўлады ставяцца да дзейнасці незалежных прафсаюзаў.

Падчас маніфестацыі плануецца агучыць праблемы кантрактнай сістэмы і працы ва ўмовах крызісу.

Ёсць таксама намер прапанаваць удзел у мерапрыемстве Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (праўладнай).

Варта зазначыць, што ў мінулым годзе мітынг быў забаронены.

*Паводле www.gazetabycom*

## “Мастоўдрэў” выплочвае запазычанасці рабочым

Выплаты запазычанасці працоўным склалі ў сярэднім 500-600 тысяч беларускіх рублёў і ажыццяўляюцца ў сувязі з тым, што напрыканцы мінулага года адміністрацыя прадпрыемства “Мастоўдрэў” пазазаконна скараціла сумы заробкаў працоўным, а таксама не аплаціла належным чынам “калядныя канікулы”, на якіх знаходзіўся працоўны калектыў.

Парушэнні законнасці дзеянняў адміністрацыі прадпрыемства былі выяўлены падчас праверак з боку пракуратуры і дзяржаўнай інспекцыі працы, ініцыятарам якіх з’яўляецца дэпутат Мастоўскага гарадскога Савета Зміцер Кухлей.

P.S.***А вось ці паўстане на абарону сваіх выбаршчыкаў хоць адзін з дваццаці дэпутатаў Бярозаўскага гарсавета? Спадзяванняў мала.***

*Паводле "Радыё Рацыя"*

***У Вас праблемы з наймальнікам?***
***Вы лічыце, што Вашыя правы парушаюцца?***
***Напішыце нам на адрас электроннай пошты:***
***hutanioman@gmail.com***
***Кваліфікаваныя юрысты незалежных прафсаюзаў разгледзяць Вашу сітуацыю і пракансультуюць Вас.***
***Бясплатна!!!***

## Па абарону – да незалежных прафсаюзаў

У Гомелі суд аднавіў на працы 14 супрацоўнікаў магазіна “Цэнтр”.

У маі кіраўніцтва звольніла ўвесь працоўны калектыў магазіна за тое, што людзі адмовіліся пакрываць за свой кошт недастачу ў 25 млн. рублёў. 14 звольненых звярнуліся ў суд і папрасілі дапамогі ў незалежным прафсаюзе РЭП.

Інтарэсы заяўнікаў у судзе прадстаўляў прававы інспектар прафсаюза РЭП Леанід Судаленка.

Пацярпелыя з дапамогай юрыстаў прафсаюза падрыхтавалі калектыўную заяву ў суд пра незаконнасць звальнення і з патрабаваннем аднаўлення на ранейшай працы з ранейшымі ўмовамі і выплаце сярэдняга заробка за час вымушанага прагула.

Суд задаволіў заяву звольненых работнікаў, бо ў адказчыка (кіраўніцтва магазіна) не было доказаў віны кожнага з працаўнікоў.

Усе пацярпелыя зараз з’яўляюцца сябрамі незалежнага прафсаюза, на сённяшні дзень яны ўпэўненыя ў сваёй прававой абароне. Бо на сваім прыкладзе паспыталі, што ад афіцыйных, праўладных, прафсаюзаў ніякай дапамогі не дачакаешся.

*Паводле БелаПАН*

**Працоўная салідарнасць**
*Інфармацыйна-аналітычнае выданне*
*г.Бярозаўка*
*Рэдактар і выдавец П.Кілішкевіч*
*Распаўсюджваецца бясплатна*
*Наклад 299 экз.*
*Друкарня “Вольны працаўнік”*
*Адказны за выпуск Л.Някозік*
*E-mail: hutanioman@gmail.com*